Журнал международного права и международных отношений. 2025. № 1/2 (112/113). С. 17—20.
Journal of International Law and International Relations. 2025. N 1/2 (112/113). P. 17—20.

УДК 327.7(476)

# ПЕРШЫ МІЖНАРОДНЫ ФОРУМ ДЛЯ БЕЛАРУСІ Ў XX ст.: ДА 80-ГОДДЗЯ САН-ФРАНЦЫСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

**Уладзімір Снапкоўскі**

*Артыкул прысвечаны 80-годдзю Сан-Францыскай канферэнцыі (25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г.), у выніку якой была створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Разгледжаны кароткая перадгісторыя канферэнцыі (канферэнцыі ў Думбартон-Оксе і Ялце), пастаноўка на іх пытання аб першапачатковым членстве саюзных рэспублік СССР у новай міжнароднай арганізацыі. Апісана палітыка савецкага кіраўніцтва, якая прадугледжвала максімальнае ўключэнне саюзных рэспублік у склад новай міжнароднай арганізацыі і прадстаўніцтва інтарэсаў Беларускай ССР і Украінскай ССР пры падрыхтоўцы і правядзенні Сан-Францыскай канферэнцыі. Паказана дзейнасць дэлегацыі Беларускай ССР на канферэнцыі.*

*Ключевые слова: Арганізацыя Аб'яднаных Нацый; Беларуская ССР; ваенная дыпламатыя; «вялікая тройка»; праблема першапачатковага членства; Сан-Францыская канферэнцыя; Украінская ССР.*

***«Belarus at the San Francisco Conference: Revisiting Its International Debut on the Conference's 80^th^ Anniversary» (Uladzimir Snapkouski)***

*This article commemorates the 80th anniversary of the San Francisco Conference (25 April — 26 June 1945), which established the United Nations. It examines the conference's antecedents, particularly the Dumbarton Oaks and Yalta conferences, where the question of UN membership for Soviet republics first arose. The analysis reveals the Soviet leadership's policy of securing maximum inclusion for its republics within the new international organisation, focusing specifically on the efforts to include the Byelorussian and Ukrainian SSRs in the run-up to San Francisco. The activities of the Byelorussian SSR delegation at the San Francisco Conference are detailed.*

*Keywords: Big Three; Byelorussian SSR; founding membership; San Francisco Conference; Ukrainian SSR; United Nations; wartime diplomacy.*

У гады Другой сусветнай вайны міжнародная дыпламатыя ўзбагацілася новым фенаменам — знешнепалітычнай дзейнасцю савецкіх саюзных рэспублік. Пасля прадстаўлення паўнамоцтваў у галіне міжнародных адносін у лютым 1944 г. іх актыўнасць на міжнароднай арэне ўвянчалася ўключэннем у склад новай міжнароднай арганізацыі дзвюх рэспублік — заснавальніц Саюза ССР: Беларускай ССР і Украінскай ССР. На ўстаноўчай канферэнцыі Аб'яднаных Нацый у Сан-Францыска абедзве рэспублікі ўвайшлі разам з саюзнай федэратыўнай дзяржавай (СССР) у склад дзяржаў — стваральніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ААН). Так у 1944—1945 гг. узнік фенамен удзелу суб'ектаў федэрацыі ў яе знешняй палітыцы і міжнародных адносінах, які ў навуковай літаратуры атрымаў назву «парадыпламатыя». У дадзеным выпадку гаворка ішла пра ўдзел саюзных рэспублік, перш за ўсё Украінскай ССР і Беларускай ССР, у агульнасаюзнай знешняй палітыцы і дыпламатыі, асабліва ў дзейнасці ААН і іншых міжнародных арганізацый (спецыялізаваных устаноў ААН) [12, с. 3—12].

Пытанню «саюзных рэспублік і савецкай дыпламатыі» прысвечана ўжо даволі багатая айчынная і замежная літаратура. Першаадкрывальнікамі гэтай тэмы былі заходнееўрапейскія спецыялісты ў галіне міжнароднага права (А. Фердрос [16, с. 121—123]). Потым з'явіліся сур'ёзныя гістарычныя даследаванні вучоных ЗША і Вялікабрытаніі (В. Аспатурыян [17], А. Далін [18] і К. Саўчук [19]). У 1960-я гг. беларускі прававед-міжнароднік Ю. П. Броўка [2] і ўкраінскія гісторыкі і прававеды К. С. Забігайла [4] і В. С. Каваль [7] апублікавалі артыкулы і манаграфіі аб удзеле Беларускай ССР і Украінскай ССР у стварэнні ААН і міжнародна-прававых пытаннях першапачатковага членства дзвюх рэспублік у новай міжнароднай арганізацыі. Удзельнік дэлегацыі СССР у Сан-Францыска, вядомы юрыст-міжнароднік С. Б. Крылоў напісаў класічную працу пра гісторыю стварэння ААН [8]. Міністр замежных спраў Беларускай ССР К. В. Кісялёў,

*Аўтар:*
**Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч** — доктар гістарычных навук, прафесар кафедры міжнародных адносін факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, *e-mail: snap@bsu.by*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Адрас: 4, пр. Незалежнасці, Мінск, 220030, БЕЛАРУСЬ*

*Author:*
**Snapkouski Uladzimir** — Doctor of History, Professor of the Department of International Relations of the Faculty of International Relations, Belarusian State University, *e-mail: snap@bsu.by*
*Belarusian State University. Address: 4, Nezavisimosti ave., 220030, Minsk, BELARUS*

якi ўзначальваў беларускую дэлегацыю ў Сан-Францыска, падрабязна апісаў яе дзейнасць у сваіх мемуарах [6, с. 51—130]. Праца дэлегацыі СССР на канферэнцыі і яе ўзаемадзеянне з прадстаўнікамі Украінскай ССР і Беларускай ССР адлюстраваны ва ўспамінах А. А. Грамыкі [3, с. 276] і іншых савецкіх дыпламатаў.

У 1993 г. аўтар гэтых радкоў выпусціў першую ў постсавецкай гістарыяграфіі манаграфію аб цярністым шляху Беларусі ў ААН [11]. У далейшым нашы даследаванні паглыблялі і пашыралі тэматыку знешнепалітычнай актыўнасці саюзных рэспублік, якая разглядалася на прыкладзе Беларускай ССР. Яны адлюстраваны ў абагульняючых працах, навучальных дапаможніках і энцыклапедычных выданнях [13; 14]. У пачатку 2020-х гг. аўтар апублікаваў дзве манаграфіі, прысвечаных палітыцы СССР па вывадзе саюзных рэспублік на міжнародную арэну ў 1943—1945 гг. і дзейнасці Беларускай ССР у ААН у 1945—1991 гг. як атраду савецкай дыпламатыі [10; 12]. Дзвюхмесячная праца Сан-Францыскай канферэнцыі ўвасоблена ў фундаментальным зборы дакументаў і матэрыялаў [15], беларускіх дакументальных зборніках па знешняй палітыцы Беларусі [1; 5]. Шмат цікавых матэрыялаў па тэме стварэння ААН змяшчае перапіска кіраўнікоў «вялікай тройкі» [9].

Перадгісторыю Сан-Францыскай канферэнцыі і вырашэння пытання пра галасы савецкіх рэспублік у міжнароднай арганізацыі трэба адлічваць з канферэнцыі ў Думбартан-Оксе (жнівень—кастрычнік 1944 г.), дзе дзякуючы кіраўніку савецкай дэлегацыі А. А. Грамыку ўзнікла таямнічае пытанне аб першапачатковым членстве саюзных рэспублік («пытанне X», ці «справа ікс»). Пытанне вырашыць не ўдалося, паколькі ЗША і Вялікабрытанія пярэчылі членству савецкіх рэспублік [9, с. 166—167].

Да Ялцінскай (Крымскай) канферэнцыі (4—11 лютага 1945 г.) урады СССР і ЗША падрыхтавалі кампрамісныя патрабаванні па працэдуры галасавання ў Савеце Бяспекі і першапачатковаму членству. Савецкі ўрад адмовіўся ад патрабавання членства для ўсіх 16 рэспублік і вылучыў просьбу аб уключэнні ў лік заснавальнікаў арганізацыі трох ці па меншай меры дзвюх рэспублік: Украіны, Беларусі і Літвы. Аргументуючы гэтую просьбу, наркам замежных спраў В. М. Молатаў падкрэсліў, што гэтыя рэспублікі панеслі найвялікшыя страты ў вайне і былі першымі тэрыторыямі, што падвергліся нямецкай агрэсіі. Прэзідэнт США Ф. Рузвельт і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі У. Чэрчыль падтрымалі просьбу І. В. Сталіна з улікам шырокага разумення міжнароднай палітыкі. Дамоўленасць аб Украіне і Беларусі па ініцыятыве Ф. Рузвельта і У. Чэрчыля была ўключана ў сакрэтны пратакол Ялцінскай канферэнцыі [9, с. 202—203].

Установчая канферэнцыя 50 дзяржаў — заснавальніц ААН адбылася 25 красавіка — 26 чэрвеня 1945 г. у Сан-Францыска. Яна была склікана паводле рашэння Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі аб стварэнні ўсеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі. Запрашэнні на Сан-Францыскую канферэнцыю былі накіраваны ад імя ўрадаў СССР, ЗША, Вялікабрытаніі і Кітая ўрадам 42 дзяржаў, якія падпісалі Дэкларацыю Аб'яднаных Нацый ад 1 студзеня 1942 г. ці далучыліся да яе потым і абвясцілі вайну краінам фашысцкага блока да 1 сакавіка 1945 г. [15, с. 61—62].

Паколькі ў ліку запрошаных не аказалася Беларускай ССР і Украінскай ССР, гэта пытанне стала прадметам вострых рознагалоссяў паміж СССР і яго заходнімі саюзнікамі. У паведамленні ТАСС «Аб удзеле Украінскай ССР і Беларускай ССР у міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі» ад 2 красавіка 1945 г. падкрэслівалася, што на Крымскай канферэнцыі савецкі ўрад прапанаваў запрасіць гэтыя «дзве асноўныя савецкія рэспублікі» для ўдзелу ў міжнароднай арганізацыі ў якасці першапачатковых дзяржаў-заснавальніц. Гэта прапанова была падтрымана ЗША і Вялікабрытаніяй. У сваю чаргу СССР і Вялікабрытанія падтрымалі просьбу ЗША аб прадастаўленні двух дадатковых галасоў у Генеральнай Асамблеі. Прэзідэнт ЗША Ф. Рузвельт 5 красавіка 1945 г. на прэс-канферэнцыі падрабязна растлумачыў сваю пазіцыю ў Ялце адносна падтрымкі просьбы І. В. Сталіна аб уключэнні Украінскай ССР і Беларускай ССР у склад першапачатковых членаў новай арганізацыі і заявіў пра сваю адмову прасіць два дадатковыя галасы для ЗША у Генеральнай Асамблеі [7, с. 224—225; 12, с. 124—127].

Калі ў сакавіку 1945 г. урады Украінскай ССР і Беларускай ССР заявілі аб намеры паслаць свае дэлегацыі на канферэнцыю ў Сан-Францыска без запрашэнняў, ЗША і Вялікабрытанія выступілі супраць, спаслаўшыся на тое, што на Крымскай канферэнцыі на гэты конт ніякіх рашэнняў не прынялі. Толькі пад націскам савецкай дыпламатыі і асабіста народнага камісара замежных спраў В. М. Молатава, які паабяцаў сарваць канферэнцыю і не прыехаць у Сан-Францыска на чале савецкай дэлегацыі, калі на яе не будуць запрошаны прадстаўнікі Украінскай ССР і Беларускай ССР, заходнія дзяржавы былі вымушаны пагадзіцца з савецкім патрабаваннем [11, с. 86—102].

На першым пасяджэнні кіраўнікоў дэлегацый (Кіруючага камітэта) 27 красавіка 1945 г. па прапанове кіраўніка дэлегацыі СССР В. М. Молатава ў парадак дня Сан-Францыскай канферэнцыі было аднагалосна ўключана пытанне аб запрашэнні Украінскай ССР і Беларускай ССР уступіць у лік першапачатковых членаў міжнароднай арганізацыі.

В. М. Молатаў ад імя іх урадаў зрабіў заявы, у якіх выказвалася іх жаданне далучыцца да міжнароднай арганізацыі і прыняць удзел у канферэнцыі. Заява ўрада Беларускай ССР на адрас Сан-Францыскай канферэнцыі была падпісана старшынёй Савета народных камісараў Беларускай ССР П. К. Панамарэнкам і наркамам замежных спраў К. В. Кісялёвым. Пасля падтрымкі савецкай прапановы кіраўнікамі дэлегацый ЗША, Вялікабрытаніі, Кітая, Францыі, Бразіліі, Чэхаславакіі і Аўстраліі канферэнцыя аднагалосна (47 галасамі) прыняла пастанову аб уключэнні Украінскай ССР і Беларускай ССР у лік першапачатковых членаў арганізацыі [15, с. 130, 336, 403—404].

На пленарным пасяджэнні Сан-Францыскай канферэнцыі 30 красавіка 1945 г. зноў аднагалосна прынялі рашэнне аб запрашэнні дэлегацый Украінскай ССР і Беларускай ССР на канферэнцыю. У гэты ж дзень на канферэнцыю быў запрошаны ўрад Аргенціны, а 5 чэрвеня 1945 г. — Даніі. Прапановы дэлегацыі СССР запрасіць на канферэнцыю часовы ўрад Польшчы былі адхілены заходнімі дзяржавамі, таму што рашэнне Крымскай канферэнцыі аб рэарганізацыі польскага ўрада яшчэ не было выканана. Аднак па патрабаванні дэлегацыі СССР Сан-Францыская канферэнцыя вырашыла лічыць Польшчу членам — заснавальнікам ААН і пакінуць у Статуце ААН месца для падпісання яго польскім урадам, што было зроблена дэлегацыяй Польшчы ў кастрычніку 1945 г. на Падрыхтоўчай камісіі ААН. Генеральны сакратар Сан-Францыскай канферэнцыі А. Хіс 1 мая 1945 г. паслаў з Вашынгтона ў Мінск наркому замежных спраў БССР К. В. Кісялёву тэлеграму, у якой паведамляў аб рашэнні канферэнцыі запрасіць Беларускую ССР стаць паўнапраўным членам міжнароднай арганізацыі, а яе прадстаўнікоў неадкладна прыбыць для ўдзелу ў канферэнцыі. Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 30 красавіка 1945 г. прызначыў дэлегацыю на Сан-Францыскую канферэнцыю ў складзе К. В. Кісялёва (кіраўнік дэлегацыі), Г. І. Байдакова, А. Р. Жэбрака, У. М. Перцава, Ф. П. Шмыгава. Дэлегацыя Беларускай ССР атрымала паўнамоцтвы падпісаць канчатковы тэкст Статута Усеагульнай міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру і бяспекі пры ўмове яго наступнай ратыфікацыі ў адпаведнасці з законамі Беларускай ССР [12, с. 270—274].

Урадавая дэлегацыя Беларускай ССР 8 мая 1945 г. прыступіла да работы ў Сан-Францыскай канферэнцыі і зрабіла канструктыўны ўклад у распрацоўку Статута ААН. Яго выпрацоўка ажыццяўлялася на падставе прапаноў, падрыхтаваных канферэнцыяй 1944 г. у Думбартан-Оксе, палажэнняў аб працэдуры галасавання ў Савеце Бяспекі ААН, узгодненых на Крымскай канферэнцыі («ялцінская формула»), а таксама шматлікіх дапаўненняў і паправак, што былі прадстаўлены дзяржавамі — ўдзельніцамі Сан-Францыскай канферэнцыі. Дэлегацыя Беларускай ССР адстойвала права аднагалосся (вета) пастаянных членаў Савета Бяспекі, выступала за ўключэнне ў Статут ААН палажэнняў аб самавызначэнні народаў, забеспячэнні інтарэсаў каланіяльных і залежных краін, пярэчыла супраць допуску фашысцкіх дзяржаў, у прыватнасці франкісцкай Іспаніі, у ААН. Па гэтых пытаннях у Статут былі ўнесены палажэнні, якія захоўвалі «ялцінскую формулу», уключалі СССР у склад Савета па апецы, закладалі палітыка-прававую аснову для антыкаланіяльнай дзейнасці, адкрывалі шлях у ААН толькі міралюбівым дзяржавам [6, с. 58—59, 65—66].

Працу канферэнцыі рэгуляваў Кіруючы камітэт у складзе старшынь усіх дэлегацый, які разглядаў галоўныя пытанні палітыкі і працэдуры. На наступным узроўні вывучэнне найбольш важных пытанняў, якія падлягалі урэгуляванню, было падзелена паміж чатырма агульнымі камісіямі, якія каардынавалі работу 12 тэхнічных камітэтаў, якім было даручана падрыхтоўваць рэдакцыйныя прапановы. Агульнае кіраванне на канферэнцыі ажыццяўляў Сакратарыят. Паралельна гэтай афіцыйнай структуры дэлегацыі праводзілі паміж сабой неафіцыйныя кансультацыі, галоўным чынам дэлегацыі пяці вялікіх дзяржаў, якія ўдзельнічалі ў канферэнцыі (ЗША, Вялікабрытанія, СССР, Кітай і Францыя) [8, с. 81—83]. На канферэнцыі было разгледжана больш за 5000 дакументаў: збор галоўных дакументаў быў апублікаваны пад назвай *«Documents of the United Nations Conference on International Organization, San Francisco, Volumes I to XX, 1945—1954»* («Дакументы Канферэнцыі Аб'яднаных Нацый па стварэнні міжнароднай арганізацыі, Сан-Францыска, тамы I—XX, 1945—1954 гг.»). У канферэнцыі ўдзельнічалі 850 дэлегатаў, а разам з іх дарадцамі, штатам дэлегацый і сакратарыятам Канферэнцыі агульная колькасць асоб, якія ўдзельнічалі ў працы канферэнцыі, дасягала 3500. Акрамя таго, было звыш 2500 прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, а таксама назіральнікаў ад розных таварыстваў і арганізацый.

Канферэнцыя ў Сан-Францыска была не толькі адной з найважнейшых падзей у гісторыі чалавецтва, але і самым шматлікім з усіх міжнародных сходаў. Главы дэлегацый чатырох дзяржаў-ініцыятараў старшынствавалі па чарзе на пленарных пасяджэннях: Энтані Ідэн (Вялікабрытанія), Вячаслаў Молатаў (Савецкі Саюз), Эдвард Стэтыніус (ЗША) і Сун Цзывень (Кітай). Пасля ад'езду В. М. Молатава з канферэнцыі дэлегацыю СССР узначаліў пасол СССР у ЗША А. А. Грамыка. Дэлегацыю Украінскай ССР узначальваў наркам замежных спраў Д. З. Мануільскі [7, с. 83; 15, с. 87, 371].

Першая з моманту стварэння ў 1919 г. Наркамата замежных спраў Беларускай ССР прэс-канферэнцыя наркама замежных спраў рэспублікі адбылася 23 мая 1945 г. К. В. Кісялёў заявіў, што Беларусь будзе праводзіць самастойную знешнюю палітыку, якая супадае ва ўсіх прынцыповых пытаннях з пазіцыяй Саюза ССР. Ён гаварыў пра магчымасць у хуткім часе ўстанавіць дыпламатычныя адносіны Беларускай ССР з замежнымі дзяржавамі, у тым ліку з ЗША [5, с. 274—277; 6, с. 99—101, 128—129]. Статут ААН, Статут Міжнароднага Суда і Часовае пагадненне аб стварэнні Падрыхтоўчай камісіі 26 чэрвеня 1945 г. падпісалі прадстаўнікі 50 дзяржаў, у тым ліку Беларускай ССР.

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 30 жніўня 1945 г. ратыфікаваў Статут ААН [5, с. 332]. 24 кастрычніка 1945 г. ратыфікацыйная грамата Беларускай ССР была здадзена на захаванне, як і ратыфікацыйныя граматы СССР і Украінскай ССР. У гэты ж дзень Статут ААН набыў сілу. 24 кастрычніка штогод адзначаецца ў свеце як Дзень Аб'яднаных Нацый [15, с. 39]. Сан-Францыская канферэнцыя з'явілася першым міжнародным форумам XX ст., у якім дэлегацыя Беларусі (у дадзеным выпадку Беларускай ССР) удзельнічала на раўнапраўнай і правамоцнай аснове [13, с. 310].

Нягледзячы на тое, што вярхоўныя органы Беларускай ССР не ставілі перад І. В. Сталіным і савецкім кіраўніцтвам пытанне аб выхадзе на міжнародную арэну ці ўключэнні ў склад міжнароднай арганізацыі, уваходжанне Беларускай ССР у ААН мела вялікае гістарычнае значэнне, адпавядала нацыянальным інтарэсам беларускага народа. Подпіс Беларускай ССР пад Статутам ААН азначаў, што сусветнае супольніцтва фармальна прызнавала яе суверэннай і незалежнай дзяржавай, якой яна фактычна не з'яўлялася ў складзе СССР. Рэспубліка атрымлівала ўсе прывілеі і імунітэты ААН, права выбірацца ў яе галоўныя органы, у тым ліку ў Савет Бяспекі, куды была ўпершыню абрана на 1974—1975 гг., магчымасць удзельнічаць у абмеркаванні ўсіх сусветных праблем, даводзіць сваю пазіцыю да ААН, уносіць на яе разгляд свае прапановы і заўвагі. Больш за 40 гадоў (да 1990 г., калі была прынята Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнтэце Беларускай ССР) ААН была для Беларусі адзіным акном у знешні свет.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914—1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў. У 4 т. Т. 4: 4 ліпеня 1944 г. — 25 жніўня 1991 г. — Мінск: Юніпак, 2015. — 448 с.
2. Броўка, Ю. П. Да пытання аб удзеле Беларускай ССР у стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый / Ю. П. Броўка // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. — 1963. — № 2. — С. 115—125.
3. Громыко, А. А. Памятное / А. А. Громыко. В 2 кн. Кн. 1. — М.: Политиздат, 1988. — 479 с.
4. Забигайло, К. С. К истории участия Украинской ССР в выработке Устава ООН / К. С. Забигайло // Сов. ежегод. междунар. права. 1964—1965. — М., 1966. — С. 123—133.
5. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў. У 10 т. Т. 4: чэрвень 1941 г. — жнівень 1945 г. / склад. Н. М. Дзятчык, У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2001. — 396 с.
6. Киселёв, К. В. Записки советского дипломата / К. В. Киселёв. — М.: Политиздат, 1974. — 527 с.
7. Коваль, В. С. Міжнародний імперіалізм і Україна. 1941—1945 / В. С. Коваль. — Київ: Навук. думка, 1966. — 268 с.
8. Крылов, С. Б. История создания Организации Объединенных Наций. Разработка текста Устава ООН (1944—1945 гг.) / С. Б. Крылов. — 2-е доп. изд. — М.: Изд-во ИМО, 1960. — 343 с.
9. Переписка Председателя Совета Министров СССР с президентами США и премьер-министрами Великобритании во время Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. / под ред. А. А. Громыко. В 2 т. Т. 2. — М.: Политиздат, 1976. — 325 с.
10. Снапковский, В. Е. Белорусская ССР в ООН: отряд советской дипломатии в действии / В. Е. Снапковский. — Минск: Право и экономика, 2021. — 318 с.
11. Снапковский, В. Е. Путь Беларуси в ООН. 1944—1945 гг. / В. Е. Снапковский. — Минск: Навука і тэхніка, 1994. — 141 с.
12. Снапковский, В. Е. Союзные республики и советская дипломатия: из истории борьбы СССР за первоначальное членство УССР и БССР в ООН (1943—1945 гг.) / В. Е. Снапковский. — Минск: Право и экономика, 2022. — 366 с.
13. Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: дапам. / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: БДУ, 2023. — 383 с.
14. Снапкоўскі, У. Е. Знешнепалітычная дзейнасць Беларусі: 1944—1953 гг. / У. Е. Снапкоўскі. — Мінск: Беларус. навука, 1997. — 207 с.
15. Советский Союз на международных конференциях периода Великой Отечественной войны, 1941—1945 гг.: сб. док. В 6 т. Т. 5: Конференция Объединенных Наций в Сан-Франциско (25 апр. — 26 июня 1945 г.) / под ред. А. А. Громыко. — М.: Политиздат, 1980. — 709 с.
16. Фердросс, А. Международное право / А. Фердросс. — М.: Иностранная лит., 1959. — 652 с.
17. Aspaturian, V. The Union Republics in the Soviet Diplomacy: a Study of Soviet federalism in the service of Soviet foreign policy / V. Aspaturian. — Paris; Geneve, 1960. — 228 p.
18. Dallin, A. The Soviet Union at the United Nations. An Inquiry into Soviet Motives and Objectives / A. Dallin. — New York: Praeger, 1962. — x, 246 p.
19. Sawczuk, K. The Ukraine in the United Nations Organization: Study in Soviet Foreign Policy, 1944—1950 / K. Sawczuk. — New York: Columbia University Press, 1975. — 158 p.


Артыкул паступіў у рэдакцыю 2 чэрвеня 2025 г.